**К. Гей**

# ВЫПРАВІМ ПАМЫЛКІ, УЗМОЦНІМ І РАЗГОРНЕМ БУДАЎНІЦТВА КОЛГАСАЎ

Асобныя выступленьні на ўсебеларускай конфэрэнцыі батрацка-бядняцкіх груп, а таксама рад паведамленьняў з месц сыгналізуюць, што частка актыўных работнікаў, партыйных і беспартыйных, няправільна ўявіла апошнія паказаньні партыі ў пытаньнях колгаснага руху, разглядаючы іх, як адступленьне.

Да чаго-ж зводзіліся гэтыя паказаньні.

Артыкул тав. Сталіна і пастановы партыйных органаў падагульваюць практыку шматмільённых сялянскіх мас у будаўніцтве соцыялістычнай сельскай гаспадаркі. Апіраючыся на гэту практыку, якая сьведчыць, што пераважная большасьць колгасаў ствараецца ў форме сельска-гаспадарчых арцеляй,— партыя высоўвае арцель, як пераважную, асноўную форму колгасу. Далей партыя цьвёрда сказала, што яе політыка ў вёсцы „апіраецца на добраахвотнасьць колгаснага руху і ўлік рознастайнасьці умоў у розных раёнах СССР". Ці магчыма добраахвотнасьць уступленьня ў колгас расцэньваць, як „адступленьне" партыі з заваяваных позыцый, як адмаўленьне ад нейкіх дасягненьняў? Відавочна, не. Апошнія паказаньні партыі не зьмяняюць асноўнай установкі нашай работы ў вёсцы, а накіраваны на зьнішчэньне тых перагібаў і скажэньняў, якіх на жаль, ёсьць досыць многа. Каб ня быць галаслоўнымі, падамо прыклад правядзеньня колектывізацыі ў сяле Стадолішчы, Лельчыцкага раёну, Мазырскае акругі. „Колектывізатары з Стадолішч абагульвалі насеньне і нават будынкі сялян, якія не ўвашлі ў колгас, правялі земляўпарадкаваньне, замацаваўшы ўсю зямлю за колгасам, пагражаючы сялянам, не жадаючым уступіць у колгас, высяленьнем на балоты, высылаю ў тундру, у Салаўкі і г. д.

Адказ на гэтае пытаньне дадзены ўжо ў гутарцы наркомзему СССР тав. Якаўлева з колгасьнікамі. „Там, дзе колектывізацыя праводзілася з перагібамі, з парушэньнем партыйнай лініі, дзе пры правядзеньні колектывізацыі былі дапушчаны адміністраванане і прымус, зусім бясспрэчна, што частка сялян, членаў колектываў, на падставе статуту, пастановіць захаваць прыватную ўласнасьць на адну карову,— гаворыць тав. Якаўлеў. - Трэба выправіць дапушчаныя памылкі і ажыцьцявіць у арцелях поўнасьцю новы статут, вярнуць колгасьнікам у індывідуальнае карыстаньне кароў, дробную жывёлу, птушку, КАЛІ ГЭТАГА ПАТРАБУЮЦЬ САМІ КОЛГАСЬНІКІ".

Такая пастаноўка пытаньня не выключае магчымасьці захаваць у арцелях поўнае абагуленьне буйное рагатае жывёлы там, дзе гэта абагуленьне праведзена ДОБРААХВОТНА самімі колгасьнікамі, дзе створаны неабходныя ўмовы для ўтрыманьня жывёлы (ацепленыя хлявы, правільны догляд і кармленьне, неабходны запас кармоў), дзе аддегласьць і інш. мясцовыя ўмовы не ствараюць нявыгад у доглядзе за жывёлаю. Там, дзе былі перагібы, дзе поўнае абагуленьне малочнай жывёлы не адпавядае інтарэсам колгасьнікаў і гаспадарча не падрыхтавана, там, дзе самі колгасьнікі гэтага патрабуюць, трэба выправіць зробленыя памылкі, г. ё. вярнуць у індывідуальнае карыстаньне няправільна абагуленых кароў, сьвіней і інш.

Адступленьня, як бачым, няма і ў гэтым пытаньні. Яно вырашаецца, выходзячы з асноўнага кіруючага прынцыпу колгаснага руху — добраахвотнасьці.

Такія агульныя кіраўнічыя паказаньні партыі ў пытаньнях колгаснага руху. Трэба з усёй энэргіяй

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы